# Гісторыя мастацтваў Беларусі

## Тэма 16.9. Жывапіс Беларусі другой паловы 20 ст.-пач. 21 стагоддзя.

**Кароткі нарыс па гісторыі мастацтваў Беларусі (Паўленка Н.В.)**
http://art-school.by/arthistory%205-belarus2.html
**План:**

1. Новы цэнтр мастацкага жыцця –Мінск. Працяг ідэалогіі соцрэалізму. Ваенная тэматыка (Раіса Кудрэвіч, Іван Стасевіч, Валянцін Волкаў, Іван Ахрэмчык, Яўген Зайцаў, Уладзімір Сухаверхаў). “Суровы стыль” як пошук новых стылістычных вырашэнняў (Петр Свентахоўскі, Міхаіл Савіцкі, Аляксандр Кішчанка, Май Данцыг). Пейзажны жанр як пошук аўтарскай мастацкай мовы і магчымасць пазбегнуць палітызаванай дыктатуры ідэалогіі.
2. З’яўленне нацыянальнай мастацкай школы – адкрыцце факультэта мастацтваў пры Тэатральным інстытуце, “адліга” 60х, пошукі індывідуальнай манеры (Валяр’яна Жолтак, Уладзімір Стальмашонак, Леанід Шчамялёў, Уладзімір Рубцоў, Гаўрыіл Вашчанка, Міхаіл Рагалевіч), савецкі андэграўнд –нонканфармізм (Ізраіль Басаў, Альгерд Малішэўскі, Георгій Скрыпнічэнка, Віталь Чарнабрысаў, Адам Глобус).
3. 80я – новая хваля жывапісу: шматварыянтнасць, змяшэнне стыляў і сінтэз жанраў“сучасны сінтэз-рэалізм”: Мікалай Селяшчук, Алесь Марачкін, Уладзімір Тоўсцік, Віктар Альшэўскі, Уладзімір Кожух, Уладзімір Савіч, Уладзімір Зінкевіч, Руслан Вашкевіч, Сяргей Грыневіч, Уладзімір Голуб, Валянціна Шоба. Абнаўленне мовы выяўленчага мастацтва –творчыя суполкі: Няміга -17 (Зоя Ліцвінава, Леанід Хобатаў, Мікалай Бушчык, Сяргей Кірушчанка,Анатоль Кузняцоў, Альгерд Малішэўскі, Алесь Цыркуноў).
4. Беларускае мастацтва ў эміграцыі (Барыс Забораў, Андрэй Задорын, Леон Тарасевіч, Андрэй Дурэйка, Ігар Цішын, Наталля Залозная, Аляксанд Родзін).
5. Рубеж 20-21 стст. – трансфармацыя беларускага мастацтва: альтэрнатыўныя галерэі, мастацкія акцыі, плыні постмадэрнізму (Аляксей Жданаў, Ігар Кашкурэвіч, Віктар Пятроў-Хруцкі, Артур Клінаў, Аляксандр Малей).
6. 21 стагоддзе – сучаснае становішча: дэкаратывізм, рэалізм,актуальнае мастацвта, “галерея Ў”, “Восеньскі салон з Белгазпромбанкам”(ГаннаСілівончык, Наталля Ляпкіна, Васілій Пешкун, Алеся Скарабагатая, Кастусь Качан, Валерый Шкаруба, Валянцін Губараў, Алена Гіль, Аляксандр Бельскі, Аляксандр Балдакоў, Дар’я Цемра).
7. Гарадзенскія мастакі: Сяргей Грыневіч, Валянціна Шоба, Юры Якавенка, Вікторыя Ільіна, Васілій Мартынчук,Уладзімір Качан,Пётр Янушкевіч, Аляксандр Сільвановіч, Алена Кузняцова, Алесь Сураў, Сяргей Стома, Сяргей Кірка, Антон Ляшчынскі, Андрэй Стурэйка, Іван Русачак, Андрэй Філіповіч, Вольга Бухоўка, Аляксандр Балдакоў, Наталля Ляпкіна, Ягор Шакаладаў, Эміль Зенько, Уладзімір Пазняк, Яўген Рамашоў, Дар’я Цемра.

**1.** Пасля другой сусветнай вайны цэнтр мастацкага жыцця змясціўся у Мінск. У Беларусь прыехала шмат выпускнікоў ВНУ Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, Льва. Рэалізм і ідэялогія сацыялістычнай дзяржавы працягвалася. Перш за ўсё - гэта праслаўленне будаўніцтва сацыялістычнага строя (прамысловая і сельскагаспадарчая тэматыка – ***Іван Стасевіч, Раіса Кудрэвіч***), але падзеі вайны, акупацыя Беларусі зрабіла свой адбітак на жывапіс - найбольш распаўсюджаным становіцца гістарычны жанр, а дакладней тэма вялікай айчыннай вайны ***(Валянцін Волкаў, Іван Ахрэмчык, Яўген Зайцаў, Уладзімір Сухаверхаў)***. Соцрэалізм і акадэмічная школа рабілі працы ўсіх мастакоў аднолькавымі па манеры пісьма.



*Іван Стасевіч “Шахцѐры Салігорска”*







*Іван Стасевіч “Партрэт С.П. Прахаровіча, шафёра”, “Капры Салігорска”*





*Раіса Кудрэвіч “Майскі дождж”, “Сяброўкі”*


*Раіса Кудрэвіч "Студэнт кансерваторыі"*






*Валянцін Волкаў "У.І. Ленін"(1964), "Партызаны" (1930)*


*Валянцін Волкаў "Мінск 3 ліпеня 1944" (1946—1953)*




*Іван Ахрэмчык “Партрэт народнай артысткі З.А. Васільевай” , “Паседжанне ЦК КПб Беларусі ўЛіозна ...1941”*



*Іван Ахрэмчык “Абарона Брэсцкай крэпасці”*



*Уладзімір Сухаверхаў“За родную Беларусь”*

 

*Яўген Зайцаў “Пахаванне героя”,“Партрэт юнага партызана”*

 

*Яўген Зайцаў “Канстанцін Заслонаў”, “Абарона Брэсцкай крэпасці 1941”*



У канцы 50х у савецкім мастацтве з’явіўся так званы “суровы стыль”, які пачаўся ў Маскве і добра падтрымаўся на Беларусі. “Суровы стыль” блізкі ў стылістычных падыходах да пошукаў мадэрнізму 20х гадоў - для яго характэрны манументальны падыход з больш фармальнай мовай мастацкай выразнасці у станковым жывапісу, падобнай да мовы плакату – вялікія каляровыя плямы, дакладныя лінейныя контуры, зварот да “прастых герояў” (***Петр Свентахоўскі, Міхаіл Савіцкі, Аляксандр Кішчанка, Май Данцыг*).** Пейзажны жанр, як непалітазаваны адыход ад соцрэалізму і найменьш падуладны ідэалагічнаму кантролю набывае вялікую папулярнасць (***Віталь Цвірка, Віктар Грамыка***).

 



*Петр Свентахоўскі “Трывога”, ”Вяселле ў Міры”*





*Міхаіл Савіцкі “Партызанская мадонна”, “Вязень 328125”, “Адбор”*




*Міхаіл Савіцкі “Куст ружаў”, “Калыханка”*






*Аляксандр Кішчанка “Мастацтвазнаўца Л.Крамарэнка”,“ Адлюстраванне”*





*Аляксандр Кішчанка панно “Беларускія партызаны”, “Габелен стагоддзя”*






*Май Данцыг “Мой Менск”, “Мой горад старажытны, малады”*



*Май Данцыг “Партызанскае вяселле”)*



*Віталь Цвірка “Ганча –зямля партызанская”, “Каложа*


*Віктар Грамыка “Глыбелька –сэрца Блакітных азѐр”, “Ільны беларускія”,*


*Віктар Грамыка “Песня аб маім атрадзе”, “Чырвоныя землі Поллачыны”);*

2. Адкрыцце ў 1953 мастацкага факультэта у Акадэміі мастацтваў (раней –Тэатральнага інстытута), “адліга” 60х паспрыяла станаўленню нацыянальных рыс беларускага мастацтва – зварот да этнічных і нацыянальных вытокаў, дэкаратывізм і пошук індывідуальнай творчай манеры (***Валяр’яна Жолтак, Уладзімір Стальмашонак, Леанід Шчамялёў, Уладзімір Рубцоў, Гаўрыіл Вашчанка, Міхаіл Рагалевіч і інш.***).

 

*Валяр'яна Жолтак "Званочкі лясныя", "Чырвоная рабіна"*

  



*Уладзімір Стальмашонак("Народны артыст СССР Р.Р. Шырма", "Якуб Колас", "Партрэт героя сацыялістычнага труда Васілія Селіванава"*

 

*Леанід Шчамялёў "Згасаючы вечар","Каляды"*





*Уладзімір Рубцоў(“Аўтабіяграфічны трыпціх: мой радавод, мая галгофа, прагулка)*







*Гаўрыіл Вашчанка“Баллада аб мужнасці”, “Спрадвеку” , “Зорка палын”*




*Міхаіл Рагалевіч “Наведванне”, “У с**адзе збіраюць яблыкі”***

Мастакі 70-80х мелі розныя творчыя стратэгіі, стараліся адыйсці ад акадэмічных прынцыпаў жывапісу і трактоўкі вобразаў, стваралі своеасаблівае кола беларускага савецкага андэграўнда - нонканфармістаў афіцыйнаму мастацтву (***Ізраіль Басаў, Альгерд Малішэўскі, Георгій Скрыпнічэнка, Віталь Чарнабрысаў, Адам Глобус***).





*Ізраіль Басаў “Рытмы горада”, “Дрэва каля ракі”, “Каханне*





*Альгерд Малішэўскі “Пад вечар”, “Лес”, “Партрэт Арлена Кашкурэвіча”*





*Георгій Скрыпнічэнка“Сустрэча”, “Аўтапартрэт 1966”, “Аўтапартрэт“*





*Віталь Чарнабрысаў “Дыяген”, “Пісьменнік”, “Салдаты”*





*Адам Глобус “Мадонна”, “Баляда. Душы Кальварыі”, “Таямная вячэра”*

3. У сярэдзіне 80х савецкая сістэма распалася, што дала імпульс да развіцця новай хвалі жывапісу, найбольш паказальнымі рысамі з'яўляюцца шматварыянтнасць, змяшэнне стыляў і сінтэз жанраў, звяртанне да прыватных пачуццяў і нацыянальнай свядомасьці – звярталіся не толькі да гісторыі, міфаў і лягенд Беларусі да савецкіх часоў, але і трагічнай чарнобыльскай тэмы (***Мікалай Селяшчук, Алесь Марачкін, Уладзімір Тоўсцік, Віктар Альшэўскі, Уладзімір Кожух, Уладзімір Савіч***).




*Мікалай Селяшчук "Госці старога парку", "Дзяцінства Анюты"*




*Алесь Марачкін "Пачатак", "Рагнеда"*






*Уладзімір Тоўсцік "Песні мінуўшых стагоддзяў"", "Цішыня"*

 

*Віктар Альшэўскі(“Нясвіж”, “Ружаны”, “Музеі свету*

 

*Уладзімір Кожух “Флора”, “Калі ноч стаеовіцца раніцай”*



 

*Уладзімір Савіч(“Адчуванне еднасці”, “Туга страчанага сусвету”*

Гэты час звязаны з паяўленнем новага пакалення мастакоў - выпускнікоў “Парнату” (навучэнцаў рэспубліканскай мастацкай школы-інтэрнату па музыке і выяўленчаму мастацтву (гімназія-вучылішча імя А.Ахрэмчыка), мастацкае вучышча ім. А.Глебава, Акадэміі мастацтваў (***Уладзімір Зінкевіч, Руслан Вашкевіч, Сяргей Грыневіч, Уладзімір Голуб, Валянціна Шоба і інш***).




*Уладзімір Зінкевіч(“Кветкі старога саду”, “Верасень”)*




*Руслан Вашкевіч серыя “Нягледзячы ні на што*






*Руслан Вашкевіч “Гісторыя з Веласкесам”, “Мост”*





*Сяргей Грыневіч з серыі “Адам і Ева”, “Паварот направа”, “Караоке”*




***Уладзімір Голуб “Вечар”, “Пацалунак”***





*Валянціна Шоба “Улада цемры”, “Пеўнік”, серыі “Дамскі пакой”*



Цікавай з'явай адбылася дзейнасць творчай суполкі "Няміга-17" (1986-2006), творчай задачай якой стала “абнаўленне мовы выяўленчага мастацвта” (***Зоя Ліцвінава, Леанід Хобатаў, Мікалай Бушчык, Сяргей Кірушчанка, Анатоль Кузняцоў, Альгерд Малішэўскі, Алесь Цыркуноў, скульптары Тамара Сакалова, Галіна Гаравая***).





*Зоя Ліцвінава “Карнавал”, “Фальклорны матыў”, “Чорны маг”*




*Леанід Хобатаў “Смак вады”, “Памеры ночы No2”*




*Мікалай Бушчык “Купальшчыца”, “Паўночны вечар”*







*Сяргей Кірушчанка “Выбар”, лэнд-арт праект “Зямля мастацвта”, “S.M. K-26 з серыі “Прасторавая медытацыя”*




*Анатоль Кузняцоў “Даліна фараонаў”, дыптых “Паэзія Басѐ”,*

  

*Алесь Цыркуноў "Барвяны шчыт. Прысвечана Уладзімеру Караткевічу", "Спрадвечнае (прысвячаецца Я.Драздовічу)" , "Дудар"*

4. У 80я гады разам з другой хваляй эміграцыі ў канцы 70 - пачатку 80х (першая хваля эміграцыі– на пачатку існавання Савецкай Беларусі) беларускі станковы жывапіс выходзіць на еўрапейскую прастору (***Барыс Забораў, Андрэй Задорын***). Выключэнне - Леон Тарасевіч, этнічны беларус, які жыве ў Польшчы. Трэцяя хваля - эміграцыя 90х - звязана з пашырэннем і пошукам інтэлектуальнай свабоды і творчасці (асабліва вялікая эміграцыя была пасля выставы "Урокі нядобрага мастацвта", пасля якой каля 20 студэнтаў былі звольнены з навучальных устаноў і вымушаны былі з'ехаць вучыцца на Захад). Стварылася моцная суполка прадстаўнікоў беларускага мастацтва на захадзе ***(Андрэй Дурэйка, Ігар Цішын, Наталля Залозная, Аляксанд Родзін і інш.)*** - актыўна уключыла беларусаў у еўрапейскія мастацкія працэсы.

 

*Барыс Забораў "Малады чалавекз капялюшам", "Гумно"*




Андрэй Задорын “Чарніцы”, “Пейзаж з інтрэр’ерам”,




Леон Тарасевіч “Безн назвы”, “Без назвы, 1987”






Андрэй Дурэйка(“Акадэмія мастацтваў. Акадэмія жыцця”, “Фініш”






Ігар Цішын “Чалавек у футляры”, “Не тураваць”, “Лёгкі партызанскі рух”




*Наталля Залозная з серыі “Пабег”, з серыі “Present Continius”,*




*Аляксандр Родзін “Фотафініш”, “Пакінь нас у спакоі*



5. Канец 20 ст. – гэта кароткі перыяд актыўнай трансфармацыі беларускага мастацтва. Абвяшчэнне ў 1991 годзе дзяржаўнага суверэнітэту спрыяла уключэнню ў сучасны святовы досвід мастацтва. Адкрываліся альтэрнатыўныя галерэі (6-я лінія (1992-1998), NOVA), ствараліся новыя мастацкія аб’яднанні (Плюраліс, Верасень, Форма і інш.), праводзіліся выстаўкі і мастацкія акцыі (In-formation (Віцебск, 1994-1999), прыток ведаў аб сучаснай заходняй культуры развіў новыя посмадэрністычныя кірункі мастацтва **(*Аляксей Жданаў, Ігар Кашкурэвіч, Людміла Русава*** *(першая прадстаўнічка перфоманса на Беларусі)***, *Віктар Пятроў (-Хруцкі), Аляксандр Малей і інш*)**.




*Аляксей Жданаў : з серыі “Мутанты”, “Хмурая раніца”*




*Ігар Кашкурэвіч “Каляровая канцэтрычная паверхня 161”,”Паверхня”*




*Людміла Русава “Партрэт Ігара Кашкурэвіча”, перфоманс “Апасля”*






*Віктар Пятроў “Пара на снезе”, “Марфа і Марыя”*




*Аляксандр Малей “Халодны жывапісны аб’ект”, “Дамінта чырвонага”*

6. Сучаснае становішча беларускага мастацтва мае драматычны характар. З аднаго боку, дзяржава, як галоўны заказчык на прадукты мастацвта, зышла з пазіцый і істотна скараціла капіталаўкладанні ў сферу культуры і мастацвта, арт-рынак, якім кіруеца ўвесь свет, так і не з’явіўся на Беларусі. Большасць творчай моладзі дае перавагу дызайну, а не чыстаму мастацтву. Фарміруецца нейкая ізаляцыя беларускага мастацтва. Аб гэтым сведчаць наяўнасць адзінкавых прыватных галерэй і нелічных арт-падзей. З другога – адкрытасць і доступ да сусветнага мастацтва падштурхнуў уключэнне у суствеtныя плыні мастацтва, спрыяе выпрацаванню самабытнасці. Пры ўсёй размаітасці мастацкай прасторы, можна вылучыць некалькі кірункаў існавання беларускага мастацвта: эклектычны (акадэмізм, метафарычнасць і дэкаратывізм) – большасць маладых мастакоў працуюць у гэтай манеры ***(Ганна Сілівончык, Наталля Ляпкіна),*** класічная рэалістычная школа ***(Кастусь Качан, Васіль Пяшкун, Валерый Шкаруба, Алеся Скарабагатая*** *і інш. )* і рэалізм у аўтарскай інтрэрпрытацыі ***(Валянцін Губараў),*** актуальнае сучаснае мастацтва **(*Руслан Вашкевіч, Уладзімір Цэслер, Алесь Пушкін*** і прадстаўнікі замежнага беларускага мастацтва). Найбольш радыкальнае сучаснае мастацтва прадстаўляе “Галерея Ў”. У 2018 годзе была прадстаўлена выстава “ZBOR ў працрэссе”, дзе экспанаваліся працы за 30 год больш чым 50 замежных беларускіх мастакоў.







*ГаннаСілівончык “Анёл-ахоўнік”, “У чаканні прынца”, “Райскі куток”*




*Наталля Ляпкіна “На сэрцы воблачна з праясненнямі”, “Рэдкая кветка”*




*Кастусь Качан “Зямля мая, зямля маіх продкаў”,”Храм”*



*Васіль  Пяшкун”Восеньскі сад”*






*Валерый Шкаруба “Вечарэе”, “Белы снег”,*




*Алеся Скарабагатая(“Уласцівасць святла”, “Чашка кавы з раніцы”*

 

*Валянцін Губараў " Позні класіцызм правінцыяльнага жыцця", "Вясна ідзе"*

Амаль адзіны значны конкурс-выстава для маладых мастакоў – "Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам" (***Алена Гіль, Аляксандр Бельскі, Аляксандр Болдакаў, Усевалад Швайба, Дар'я Цемра*** *і інш*).

 

*Алена Гіль з серыі "365 аўтапартрэтаў", Звяры і птушкі"*



*Аляксандр Бельскі "Ляжачага не б'юць"*



*Аляксандр Бельскі "Восеньскія працы ў садзе"*





*Аляксандр Балдакоў “Мроі”, Дар’я Цемра з серыі “Спадчына”*





*Усевалад Швайба “Armaturamater III” , “Armaturamater II”*

7. Гарадзенскія мастакі. Пачынаючы з 50х гадоў ў Гродна накіроўваліся выпускнікі ВНУ мастацкага профіля. Вельмі хутка стварылася цудоўнае кола высокапрафесійных мастакоў, шмат з каторых атрымоўваць узнагароды сусветнага ўзроўню. На сёняшні дзень ў Гродна існуе некалькі таварыстваў мастакоў - Саюз мастакоў Беларусі (больш за 70 членаў - гарадзенцаў), таварыства польсіх мастакоў (больш за 500, таварыства рамеснікаў і самастойныя мастакі. Але на гледзячы на тое, што ў Гродна предстаўлена ўся лінейка мастацкай адукацыі -з 90х па мастацкаму профілю выпускаюцца навучэнцы школы і коледжа мастацтва, Гродзенскага дзяржаўнага універсытэту, захоўваецца агульная сітуацыя для Беларусі -мастацкі цэнтр жыцця і яскравыя мастацкія падзеі знаходзіцца ў Мінску. На сёняшні дзень гарадзенскі мастацкі сусвет прадстаўляюць як майстры старэйшага пакалення ***Сяргей Грыневіч, Валянціна Шоба, Юры Якавенка*** *(графіка),* ***Вікторыя Ільіна, Васілій Мартынчук, Уладзімір Качан, Пётр Янушкевіч, Аляксандр Сільвановіч, Алена Кузняцова, Алесь Сураў, Сяргей Стома,***

***Сяргей Кірка, Антон Ляшчынскі, Андрэй Стурэйка, Анатоль Скамарошчанка***, сярэдняга і маладога: ***Іван Русачак, Андрэй Філіповіч, Вольга Бухоўка, Аляксандр Болдакаў, Наталля Ляпкіна, Сняжана Віцецкая, Вольга Шчарбінская, Дар'я Цемра (Сямчук),*** у эміграцыі: ***Уладзімір Пазняк****, **Эміль Зенько (Emilio Anormale), Яўген Рамашоў** ), **Ягор Шакаладаў*** і г.д.





*Сяргей Грыневіч"Гарадзенскі пейзаж. Турма",* *Валянціна Шоба"Конік",*





*Вікторыя Ільіна "Горад",* *Васілій Мартынчук"Адам і Ева"*





*Уладзімір Качан "Давыд Гарадзенскі",* *Пётр Янушкевіч"Два музыкі"*



*Аляксандр Сільвановіч“Анѐл”,*



*Алена Кузняцова“Рабінавая восень”*



*Алесь Сураў “Дон Кіхот”,*



*Сяргей Стома“Выкраданне Еўропы”*





*Сяргей  Кірка“Імправізацыя” ,*



*Антон Ляшчынскі“Піктарэалізм”*




Андрэй Стурэйка“Гарачы пацалунак” , Анатоль Скамарошчанка “Першы снег”







Іван Русачак“Затоіў дыханне”, Андрэй Філіповіч“Фарны касцёл у Гродна”





Вольга Бухоўка“Каляды”, Сняжана Віцецкая “Зося”





*Наталля Ляпкіна“Конік”,* *Вольга Шчарбінская “Блакітны бераг”*





*Аляксандр Болдакаў“Фабула”,* *Уладзімір Пазняк“Новы слоўнік старых рэчаў”*




*Дар’я Цемра “Культурны трэнд”*





Эміль Зенько“Народжанне”, Яўген Рамашоў“Фецiш”



Ягор Шакаладаў “У ноч перад Разством”